КАВА
ЯК АРТ-ПРАДУКТ
4

БРАМА
ДА МАРЫ
13

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+ТВ ПРАГРАМА

27 МАЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 102 (29724)

КАРОТКА

• Учора на Віцебшчыне адбыўся адзіны дзень прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі. Старшыня верхняй палаты парламента Наталля Качанава прымала наведвальнікаў у Віцебску.

• **Каля палігона Уручча знойдзена масавае пахаванне часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

• У БДУ ў два разы вырас мэтавы план прыёму.

• **З уводам АЭС доля прыроднага газу ў энергабалансе Беларусі знізіцца да 60 працэнтаў.**

• Тарыфы на цеплазабеспячэнне, газ і электрычнасць скарэктуюць у Беларусі з 1 чэрвеня.

• **Да праекта ЕАЭС «Еўразійскі аграэкспрэс» далучыліся новыя ўдзельнікі.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Праблема харчовай бяспекі ЕАЭС стала ключавой для сусветных рынкаў. Ва ўмовах нестабільнай глабальнай эканамічнай сітуацыі і непартнёрскіх паводзінаў шэрагу замежных дзяржаў у ЕАЭС з'яўляецца магчымасць стаць глабальным гульцом у сферы харчовай бяспекі. Нядаўна Савет ЕЭК зацвердзіў агульныя прынцыпы і падыходы да забеспячэння харчовай бяспекі дзяржаў-членаў. Неабходна ў гэтым напрамку актыўна рухацца далей. Процідзейнічаць выклікам, мінімізаваць рызыкі ўзнікнення дэфіцыту харчовых тавараў на ўнутраных рынках і нарошчваць экспарт у трэція краіны неабходна на калектыўнай аснове».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Узровень ваенных пагроз Беларусі на перспектыву будзе нарастаць»

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі на нарадзе па пытаннях забеспячэння ваеннай бяспекі, якую правёў у Цэнтры стратэгічнага кіравання Міністэрства абароны.

Фота БелТА.

«Мы павінны вызначыць асноўныя напрамкі далейшага развіцця нашай арміі. Зыходзім з таго, што ўзровень ваенных пагроз Беларусі на перспектыву будзе нарастаць, і гэтыя меры неабходна прыняць у самыя кароткія тэрміны. Лепш раней, чым позна, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму на нарадзе з кіруючым саставам Міністэрства абароны мною была пастаўлена задача аб прапрацоўцы прапаноў па ўдакладненні напрамкаў развіцця Узброеных Сіл у сучасных умовах».

Асноўная тэма сустрэчы з ваеннымі, як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, — карэкціроўка напрамкаў далейшага развіцця нашых Узброеных Сіл.

«Падзеі, што адбываюцца ў сумежных дзяржавах, сведчаць аб высокай дынаміцы змяненняў пагроз ваеннай бяспецы Рэспублікі Беларусь. Трансфармуюцца таксама погляды на прымяненне ваеннай сілы і спосабы ўзброенай барацьбы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Буслíны падворак

Гэты падворак знаходзіцца ў вёсцы Рэдзькі Маладзечанскага раёна. Вялікая колькасць белых буслоў часта адпачывае то на адным, то на іншым вясковых агародах. Гэтым разам мне пашчасціла ўбачыць птушак каля сядзібы Мікалая Макарэвіча.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Полацку — 1160 гадоў

ЛЯ ДЗВІНЫ І ПАЛАТЫ СТАІЦЬ ГОРАД СВЯТЫ

Сёння, 27 мая, у Полацку стартуе свята, якое датычыцца кожнага беларуса — юбілей самага старажытнага горада на нашых землях, аднаго з першых сярод славянскіх гарадоў — 1160 гадоў з часу яго заснавання. Праграма святкавання разлічана на тры дні, але асэнсаванне падзеі — справа куды больш працяглая, бо яна напаўняе нас гонарам, натхняе і захапляе сваім зместам. І як ілюстрацыя і пацвярджэнне гэтаму — у свет выходзяць дзве кнігі-альбомы вядомага гісторыка і калекцыянера, лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА. Назвы выданняў гавораць самі за сябе: «Полацк. Першая сталіца» і «Полацк. Крыніца ведаў і асветы прамень». Двухтомнік знаёміць з калекцыяй гісторыка, якая збіралася амаль паўстагоддзя. Рарытэты нагадваюць пра легендарныя і адкрываюць малавядомыя старонкі гісторыі горада, з якога пачалася сучасная незалежная Беларусь. Напярэдадні святкавання юбілею Полацка мы пагутарылі з аўтарам аб яго новым праекце.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 — 763X

«Узровень ваенных пагроз Беларусі на перспектыву будзе нарастаць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле яго, да пачатку ваеннай аперацыі Расіі на Украіне беларускія ваенныя зусім па-іншаму думалі пра далейшыя шляхі мадэрнізацыі Узброеных Сіл. «Прайшло два месяцы супрацьстаяння Украіны і Расіі. І мы ўбачылі, што нам не трэба такую мадэрнізацыю праводзіць, як мы тады замахнуліся, — вельмі дарагую і для нашай краіны, нашых умоў непрымальную. Мы зразумелі, якая павінна быць у нас армія. Таму і пытанне па карэкціроўцы...» — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт заявіў, што Злучаныя Штаты і іх сатэліты працягваюць рэалізацыю курса на абвастрэнне адносін фактычна з усім светам (асабліва з Расіяй і Кітаем), нарошчваюць ваенную прысутнасць паблізу граніц Беларусі як саюзніка Расіі, праводзяць маштабныя вучэнні.

«Пад прыкрыццём абарончай тэматыкі гэтых манеўраў адпрацоўваюцца пытанні перакідання войскаў з Амерыкі і Заходняй Еўропы, стварэння і прымянення груповак, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы бачым сапраўдныя мэты мерапрыемстваў, што праводзяць натаўцы. Па сутнасці, гэта разведка і засваенне магчымага ў будучыні тэатра ваенных дзеянняў».

Паводле Прэзідэнта, па задуме Амерыкі Еўропа і НАТА ўступілі ў глабальнае супрацьстаянне з Расіяй, а Беларусі ў гэтай барацьбе прыйдзецца сутыкнуцца з беспрэцэдэнтным і працяглым эканамічным, палітычным і ваенным ціскам.

«Некалькі гадоў таму я пра гэта казаў. Наша бяда ў тым, што Гасподзь нас размясціў у цэнтры Еўразіі, Еўрапейскага кантынента. І, што б тут ні адбывалася, заўсёды на тэрыторыі Беларусі сутыкаюцца асноўныя інтарэсы буйных ігракоў. Так яно і адбываецца. Дзякуй богу, пакуль без ваеннага супрацьстаяння», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

«Пры гэтым ваенны ціск будзе аказвацца праз Польшчу, Літву, Латвію і дыслакаваныя там войскі НАТА, а таксама за кошт падтрымання і эскалацыі баявых дзеянняў ва Украіне», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Паводле яго меркавання, новаму фронту баявых дзеянняў ва Украіне неабходна ўдзяліць увагу, а ваенныя павінны праводзіць ратацыю, каб абкатваць сваю падрыхтоўку. «Гэта ўмова ваеннага часу. Пакуль без вайны. Я адчуваю і атрымліваю інфармацыю, што хлопцы вядуць сябе там годна. І нам неабходна адпрацоўваць планаванне ў гэтых умовах. Калі, не дай бог, вайна, як дзейнічаць мы будзем?!» — задаў пытанне Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што абстаноўка, якая складваецца, як ніколі патрабуе ад войскаў быць гатовымі ў любую хвіліну даць адэкватны адказ ваенным намерам у бок Беларусі.

З дакладам на тэму ўдакладнення кірункаў развіцця Узброеных Сіл Беларусі выступіў міністр абароны Віктар Хрэнін.

Таксама Прэзідэнт заявіў аб неабходнасці ўзмацняць інфармацыйнае процідзеянне.

«Работа па інфармацыйным процідзеянні — у гэтым кірунку мы працуем. Не скажу, што мы тут дабіліся вялікіх поспехаў, але без інфармацыйнага забеспячэння той работы, якую мы, ваенныя, у краіне вядзём, сёння немагчыма. Гэта не будучыня, гэта ўжо сучаснасць. І мы недзе ўжо адсталі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што неабходна ўзмацняць работу па напрамках інфармацыйнага процідзеяння, таму што ваенныя дзеянні ў сучасным свеце маюць комплексны характар. «Гэта і эканамічная вайна, і інфармацыйная вайна, і гарачая вайна. Гэта значыць — гібрыдныя войны. Таму трэба развіваць усе напрамкі, як бы нам ні было складана», — абазначыў задачы Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Міністр абароны Віктар ХРЭНІН у размове з журналістамі адзначыў, што карэкціроўка напрамкаў далейшага развіцця Узброеных Сіл адбываецца па сямі напрамках.

«Гэтыя напрамкі неабходна ўдакладніць, у тым ліку зыходзячы са спецыяльнай ваеннай аперацыі Расійскай Федэрацыі на тэрыторыі Украіны. Мы па-іншаму сталі глядзець на формы і спосабы выкарыстання войскаў. І неабходна, як сказаў кіраўнік краіны, каб мы, ваенныя, бачылі будучую вайну. Мы спрагназавалі магчымыя рызыкі і пагрозы ў будучыні», — сказаў Віктар Хрэнін.

Па яго словах, у цэлым Прэзідэнт ухваліў работу ваенных, але падкрэсліў неабходнасць яшчэ раз усё ўдакладніць.

«Асноўным напрамкам будзе развіццё сіл спецыяльных аперацый, сучасных сродкаў узбраення, змяненне форм і спосабаў вядзення ваенных дзеянняў. Менавіта так мы будзем удакладняць развіццё нашых ваенных сіл», — сказаў міністр.

Ён дадаў, што ваенныя Беларусі глядзяць і за развіццём узброеных сіл краін НАТА, якія таксама ўдасканальваюцца.

Міністр яшчэ раз нагадаў пазіцыю Беларусі ў адносінах да ваеннай бяспекі: «Кажам на ўсіх міжнародных пляцоўках: «Мы нікому не пагражаем. Хочам жыць на сваёй зямлі, развівацца самі, быць самастойнымі і незалежнымі. Зыходзячы з гэтага, нашы Узброеныя Сілы не з'яўляюцца інструментам вядзення вайны. Гэта інструмент недапушчэння вайны».

Віктар Хрэнін расказаў пра сённяшнюю абстаноўку на граніцах краіны. Асноўны хвалюючы момант — вучэнне НАТА «Абаронца Еўропы – 2022», пад выглядам якога, запэўніў суразмоўца, праходзіць яшчэ 21 іншае вучэнне.

«Усе гэтыя вучэнні аб'яднаны адзінай задумай і планам. Колькасць войскаў у разы ўзрасла ў рамках узмацнення ўсходняга фланга. У рамках аперацый «Атлантычная рашучасць» узмоцнена перадавая прысутнасць. Амаль 39 тысяч ваеннаслужачых краін НАТА зараз удзельнічаюць у разнастайных аперацыях. Большасць з іх — ваеннаслужачыя ЗША», — паведаміў міністр абароны.

Ён звярнуў увагу і на вялікую колькасць палётаў разведвальнай авіяцыі вакол нашай граніцы з тэрыторыі Прыбалтыкі і Польшчы з мэтай падрыхтоўкі лётчыкаў.

«Нас гэта не можа не хваляваць. Мы за гэтым уважліва сочым, выпрацоўваем комплекс мер, каб не дапусціць пераходу такога напружання ў гарачую фазу», — рэзюмаваў Віктар Хрэнін.

Год гістарычнай памяці

ЗАХАВАЦЬ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

Да пачатку новага навучальнага года ў кожнай мінскай школе будзе створаны музей

Такую задачу перад сферай адукацыі сталіцы падчас пасяджэння аб правядзенні мерапрыемстваў у межах Года гістарычнай памяці паставіў старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ. Акрамя таго, па прапанове кіраўніка горада шырокая патрыятычная работа будзе разгорнута і ў дашкольных установах адукацыі.

Падчас пасяджэння абмеркавалі не толькі тое, што будзе ажыццёўлена ўладамі сталіцы ў межах Года гістарычнай памяці, але акцэнтавалі ўвагу і на ўжо рэалізаваных праектах. З пачатку года на тэрыторыі Мінска быў праведзены шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне адзінства беларускага народа і беларускай дзяржаўнасці, а таксама на захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Акрамя традыцыйных, ініцыяваны і шэраг новых гарадскіх праектаў, у тым ліку звязаных з увекавечваннем памяці ахвяр генацыду беларускага народа ў гады ваеннага ліхалецця.

— Гістарычная памяць — адна з фундаментальных асноў беларускага грамадства, — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА**. — Менавіта таму ў сучасных умовах яна знайшла сваё адлюстраванне ў тым ліку ў абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Аб'яўлены ўказам Прэзідэнта Год гістарычнай памяці — этап, які падкрэслівае актуальнасць таго, што і грамадства, і дзяржава павінны выступіць адзіным фронтам у абароне сваёй гісторыі, традыцый, культуры, свайго права самастойна вызначаць шлях развіцця.

Па словах Вольгі Чамаданавай, сёння мы часцей павінны гаварыць аб героях, якія абаранялі і вызвалялі горад Мінск ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У найбліжэйшы час аб гэтых людзях будзе расказвацца ў гарадскім транспарце сталіцы, а білборды з партрэтамі абаронцаў і вызваліцеляў Мінска з'явяцца на ключавых гарадскіх магістралях, у тым ліку на мінскай кальцавой аўтамабільнай дарозе. Акрамя таго, працягнецца работа па прысваенні імён удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, Герояў Савецкага Саюза, вядомых і знакамітых землякоў установам адукацыі і вуліцам горада. Будуць ажыццяўляцца турыстычныя маршруты па аб'ектах воінскай славы, гістарычных месцах.

Як расказала **старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Наталля ПРАСКУРАВА**, у бягучым годзе, аб'яўленым Годам гістарычнай памяці, у сістэме сталічнай адукацыі перафарматавалі падыходы да выхаваўчага працэсу. «Сёння ў сістэме адукацыі Мінска — 18 маштабных круглагадовых грамадзянска-патрыятычных акцый, якія прадугледжваюць падрыхтоўку і правядзенне на працягу навучальнага года звыш 650 мерапрыемстваў, — заўважыла старшыня камітэта. — Вядзецца актыўная работа па стварэнні на базе школьных музеяў пляцовак, прысвечаных генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

Да канца года з'явяцца ваенна-патрыятычныя клубы ў тых раёнах Мінска, дзе іх пакуль няма. Распрацаваны новыя экскурсійныя маршруты ваенна-патрыятычнай накіраванасці. Аб мерапрыемствах у сферы культуры, прымеркаваных да Года гістарычнай памяці, расказаў **начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Віталь БРЭЛЬ**. У прыватнасці, 3 ліпеня, у Дзень Незалежнасці, у гонар загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны ў цэнтры Мінска — на тэрыторыі парку Перамогі — будзе адкрыты памятны знак «Жывая памяць удзячных пакаленняў». У найбліжэйшы час у сталіцы з'явяцца і мемарыяльныя дошкі ўдзельнікам ваенных падзей, а таксама вядомым грамадзянам пасляваеннага часу. Ужо рэалізоўваецца шэраг выставачных праектаў і культурных праграм, накіраваных на захаванне памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

Вераніка КАНЮТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнт Сербіі: Еўрасаюз страчвае папулярнасць

Краіны, якія жадаюць увайсці ў склад Еўрапейскага саюза, не адчуваюць павагі з боку Бруселя. У сувязі з гэтым сама ідэя далучэння да ЕС становіцца ўсё менш папулярнай. Аб гэтым заявіў сербскі лідар Аляксандр Вучыч у час эканамічнага форуму, які праходзіць гэтымі днямі ў швейцарскім Давосе, паведамляе ТАСС.

Паводле слоў Аляксандра Вучыча, зацікаўленасць у далучэнні да ЕС знізілася, у прыватнасці, у Сербіі і Паўночнай Македоніі. Прэзідэнт адзначыў, што трэба задумацца над прычынамі такой сітуацыі. На яго думку, краіны павінны адчуваць, што іх інтарэсы паважаюць у Бруселі, тады яны будуць хацець далучыцца да Еўрасаюза.

Сербскі лідар таксама заявіў, што яго краіна ўдзячная за эканамічную дапамогу з боку ЕС. Аднак нельга ўзамен пастаянна штосьці патрабаваць ад Бялграда, прызнанне гэта Косава або ўвядзенне санкцый у адносінах да Масквы. «Спакойна, людзі, у нас свая дзяржава, свае інтарэсы», — сказаў Аляксандр Вучыч. Ён таксама папракнуў Еўропу ў крывадушнасці, паколькі калісьці заходнія краіны аднялі ў Сербіі Косава, а цяпер змагаюцца за тэрытарыяльную цэласнасць Украіны.

МЗС РФ: ЗША спрабуюць выкарыстаць «расійскую пагрозу» ў Афрыцы для ўмацавання пазіцый НАТА

Пра гэта заявіў намеснік кіраўніка Міністэрства замежных спраў Расіі Аляксандр Грушко, перадае РІА «Навіны».

Раней кіраўнікі мінабароны Іспаніі і Вялікабрытаніі заявілі, што пашырэнне ўплыву Расійскай Федэрацыі на афрыканскім кантыненце — гэта трывожная пагроза бяспецы Паўночнаатлантычнага альянсу разам з сітуацыяй ва Украіне, і блок павінен вырашыць дадзеную праблему.

На думку Грушко, такія заявы сведчаць аб тым, што Вашынгтон спрабуе надаць НАТА функцыі «сусветнага жандара» далёка за межамі першапачатковай зоны адказнасці. Дыпламат адзначыў, што ЗША хочуць найперш выкарыстоўваць ваенны блок для стрымлівання Кітая.

Датычна Афрыкі прадстаўнік МЗС нагадаў аб наступствах дзеянняў НАТА ў Іраку, Лівіі, Сірыі. «У выніку інтэрвенцый краін НАТА і эксперыментаў у сферы сацыяльна-палітычнай інжынерыі, у тым ліку ваеннымі сродкамі, гіганцкія прасторы пазбавіліся ўсякай дзяржаўнасці, ператварыліся ў прыстанішча і рассаднік тэрарызму», — сказаў Грушко.

Прадказана знікненне смартфонаў у будучыні

Топ-менеджары Nokia прадказалі з'яўленне сетак 6G да 2030 года, паведамляе тэлеканал CNBC.

Выступаючы на Сусветным эканамічным форуме ў Давосе, генеральны дырэктар Nokia Пека Лундмарк заявіў, што сеткі шостага пакалення з'явяцца на камерцыйным рынку да 2030 года. Таксама прадпрымальнік заўважыў, што ў недалёкай будучыні смартфон «перастане быць самым распаўсюджаным інтэрфейсам».

Лундмарк выказаў здагадку, што да канца дзесяцігоддзя чалавецтва пачне адмаўляцца ад звычайных тэлефонаў на карысць больш зручнейшых і сучасных прылад. Да іх кіраўнік Nokia аднёс разумныя акуляры і іншыя дэвайсы, якія карыстальнікі будуць насіць на твары. «Многія з гэтых рэчаў будуць убудаваны непасрэдна ў нашы целы», — заявіў Лундмарк. Таксама топ-менеджар карпарацыі прадказаў, што да 2030 года з'явіцца тэхналогія стварэння лічбавых двайнікоў, што запатрабуе «велізарных вылічальных рэсурсаў».

Выступаючы на той жа сесіі, фінансавы дырэктар Google Рут Парат заявіла, што тэхналогіі дапоўненай рэальнасці дазволяць вырашыць мноства бытавых праблем.

Усе на свята!

КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТРА БЕЛАРУСІ

XIII Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, які ўжо стаў адным з прыкметных брэндаў, сёлета пройдзе з 3 да 5 чэрвеня ў Гродне. На працягу трох дзён гасцей будзе чакаць насычаная праграма. На 17 падвор'ях прадставяць 31 нацыянальнасць, і кожная зможа заявіць пра сябе.

— Хочацца запрасіць гасцей і жыхароў краіны прыняць удзел у фестывалі нацыянальных культур. Мы бачым актуальнасць правядзення свята і як павялічылася да яго цікавасць, — адзначыла **начальнік управлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Ірына КАРПОВІЧ**. — У гарадзе збяруцца дзясяткі нацыянальнасцяў і прадэманструюць сваю культуру, традыцыі і звычаі. Такі фармат фестывалю адзіны ў нашай краіне, таму кожны раз з'яўляецца нешта цікавае, павялічваецца колькасць удзельнікаў. Спадзяёмся, падзея ў гэтым годзе загучыць зусім па-новаму і надасць новых фарбаў фестывальнаму руху і турыстычнаму патэнцыялу Беларусі.

Упершыню сярод удзельнікаў — мангольская нацыянальнасць. І ў знак гэтай падзеі на алеі Сяброўства ў Каложскім парку з'явіцца новае дрэва. Акрамя гэтага, першы раз на фестываль запрошаны прадстаўнікі беларусаў замежжа — калектывы з Санкт-Пецярбурга і Рыгі.

Урачыстае адкрыццё адбудзецца 3 чэрвеня вечарам. І аздобяць яго гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі і нацыянальных дыяспар «Агонь адзінства», піратэхнічнае шоу і выступленні хэдлайнераў. Таксама ў першы дзень мерапрыемства адбудзецца адкрыццё Дома рыбака па вуліцы Замкавай, які пабудаваны па прынцыпе гістарычнага аднаўлення. На наступны дзень на беларускім падвор'і «Дамашні ачаг» калектывы і майстры народнай творчасці пакажуць культурныя асаблівасці беларускіх рэгіёнаў. Яшчэ наведвальнікаў будзе чакаць кінадворык, літаратурныя сустрэчы і шэраг майстар-класаў. У гэты ж дзень запланавана адкрыццё тэматычнай скульптуры, прысвечанай фестывалю, на вуліцы Тэльмана.

Як і ў 2018 годзе, трэці дзень фэсту правядуць на Аўгустоўскім канале, дзе размесцяцца інтэрактыўныя і канцэртныя пляцоўкі свята. Шырока рыхтуюцца прадставіць пляцоўку ад маладзёжнага аб'яднання БРСМ. Таксама тут 5 чэрвеня адкрыецца «Фестываль культуры ўсіх народаў», у межах якога згадаюцца эпізоды некаторых знакамітых фестываляў у культуры розных нацыянальнасцяў, а таксама наведвальнікі ўбачаць прэзентацыю вырабаў народных майстроў і цэнтраў рамёстваў Гродзенскай вобласці.

Фестываль нацыянальных культур праводзіцца з 1996 года (кожныя два гады). І, як адзначыла рэжысёр свята Агата Мацко, сёлета тут імкнуліся максімальна захаваць традыцыі, закладзеныя пачынальнікамі, але разам з тым надаць ім актуальнае і сучаснае гучанне.

Алена ДРАПКО.

У тэму

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК: «Сярод удзельнікаў фестывалю Нацыянальных культур у Гродне будуць прадстаўлены найбольш буйныя нацыянальныя меншасці, якія жывуць у нашай краіне. Паводле даных перапісу 2019 года, у Беларусі пражываюць прадстаўнікі 25 канфесій і 156 нацыянальнасцяў. У тым ліку рускія, украінцы, палякі, яўрэі, літоўцы, татары, ёсць прадстаўнікі нацыянальнасцяў, якія апынуліся ў міграцыйных патоках, напрыклад афганцы, палесінцы, армяне, азербайджанцы і іншыя. Фестываль у Гродне — гэта добрая магчымасць прадставіць сваю нацыянальную культуру. За ўсімі дэлегацыямі будуць замацаваны арганізацыі і прадпрыемствы Гродзенскай вобласці, якія будуць дапамагаць нацыянальнасцям у афармленні падворка. Гэта будзе сузор'е нацыянальных культур і вялікае свята для ўсіх жыхароў Беларусі».

ЛЯ ДЗВІНЫ І ПАЛАТЫ СТАІЦЬ ГОРАД СВЯТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Я сам родам з Полацка, у мяне даўно пытаюцца: як жа так, палачанін, ужо больш 40 кніг-альбомаў зрабіў, а пра Полацк — ніводнай. Вось рукі дайшлі да малой радзімы, і на свет выйшла не адна, а адразу дзве кнігі. Яны на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай, адна адну дапаўняюць.

— Чаму менавіта дзве?

— З-за колькасці эксклюзіўнага матэрыялу. Можна было б і чатыры зрабіць. Але і гэтыя дзве, у параўнанні з іншымі, досыць тоўстыя — 288 і 304 старонкі. У першай хацелася паказаць, як выглядаў горад у мінулыя стагоддзі. Кнігі ўтрымліваюць тэкст і не толькі фатаграфіі і паштоўкі, як звычайна ў маіх выданнях, але і шматлікія ўнікальныя артэфакты і дакументы. Усё, што там ёсць, — з маёй калекцыі, там шмат унікальных рэчаў. Не браў нічога з музеяў або архіваў.


Обѣдъ Полочанъ.
5 Декабря 1903 г.
MENU.
Hors d'oeuvres.
Bortche.
Consommé printanière.
petits pâtés.
Filet aux poissons morlis.
Gibier: lièvres et gelinottes.
Plombière glacé.
Café.

Першы альбом дазваляе ўбачыць, як выглядаў Полацк на старажытных абразах, гравюрах, літаграфіях, картах, фатаграфіях розных перыядаў. Завяршаецца гэты шэраг святкаваннем 1100-гадовага юбілею.

Другая кніга — «Полацк. Крыніца ведаў і асветы прамень» — аповед пра горад — духоўны і адукацыйны цэнтр, найбуйнейшы ва Усходняй Еўропе. З кнігі можна даведацца шмат цікавых фактаў пра княгіню Рагнеду, яе сыноў Ізяслава, якога празвалі Кніжнікам, і Яраслава Мудрага, пры якім быў складзены першы звод законаў «Руская праўда» — на 500 гадоў раней за Статут Вялікага Княства Літоўскага! У кнізе адлюстравана тэндэнцыя, якая прывяла да з'яўлення такіх асветнікаў сусветнага маштабу, як Еўфрасіння Полацкая і Францыск Скарына.

Нездарма ў XVI стагоддзі быў заснаваны Полацкі калегіум, які ў пачатку XIX стагоддзя пераўтвораны ў Полацкую акадэмію — першую вышэйшую навучальную ўстанову на тэрыторыі нашай краіны. У тым жа будынку пазней адкрыўся Полацкі кадэцкі корпус, пераемнікам якога з'яўляецца Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.

Расказваю і аб сваім гісторыка-асветніцкім праекце «У пошуках страчанага», які распачаўся на старонках выдання «СБ. Беларусь сегодня» і які падтрымлівае Выдавецкі дом «Звязда».

Праз фатаграфіі і ўнікальныя артэфакты альбомы паказваюць, як у Полацку перапляталіся развіццё навукі, адукацыі і асветніцтва. Напрыклад, можна ўбачыць парту XVIII стагоддзя з акадэміі, кнігі, сшыткі, асабістыя рэчы...

Цяжка вылучыць нешта. Ёсць кніга, якую падпісаў і падарыў дырэктар кадэцкага корпуса генерал-маёр Тыртоў аднаму з вучняў. Набор алоўкаў заснавальніка рускай феналогіі, арнітолага, прафесара Дзмітрыя Нічыпаравіча Кайгародава, былога выхаванца Полацкага кадэцкага корпуса. Упрыгожаны каляровай эмаллю і пазалотай срэбны пісьмовы прыбор яго сына, знакамітага мастака Анатоля Кайгародава. Даведнік акадэміі 1814 года з пералікам прадметаў, якія там вывучаліся. Першае грунтоўнае выданне «Жыція Еўфрасінні Полацкай» 1781 года. Сувенірная картка з абедзенным меню кадэтаў 5 снежня 1903 года на французскай мове: закускі, боршч, кансамэ прэнтаньер (суп з вясновай гародніны) з маленькімі піражкамі, філе рыбы марлін, дзічына — заечына і рабчык, пламбір і кава... І такіх цікавых рэчаў безліч.

— Колькі вы збіралі гэтую калекцыю?

— Амаль паўстагоддзя — 47 гадоў.

— А вам 57?

— Так. Яна пачалася менавіта з Полацка. Потым распаўсюдзілася

ПОЛАЦК
Першая сталіца

«Першы альбом дазваляе ўбачыць, як выглядаў Полацк на старажытных абразах, гравюрах, літаграфіях, картах, фатаграфіях розных перыядаў. Завяршаецца гэты шэраг святкаваннем 1100-гадовага юбілею».

на ўсю Беларусь. Праекту «У пошуках страчанага» ўжо 18 гадоў. Паступова захапленне перарасло ў работу. Таму ўжо больш за 40 кніг на дадзеную тэму, сотні выстаў, тысячы публікацый.

— На адной з гравюр XIX стагоддзя, размешчанай у кнізе «Полацк. Першая сталіца», можна ўбачыць храмы горада са старажытнай іконы прападобнай Ефрасінні. Там іх, прынамсі, шэсць.

— У кнізе шмат выяў цэркваў, якія не захаваліся. У тым ліку каменныя храмы Барысаглебскага манастыра XII стагоддзя. Велічны і адначасова паветраны Свята-Мікалаеўскі сабор першай паловы XVIII стагоддзя, страчаны помнік віленскага барока, а таксама яго ўнутраны выгляд...

Але тут не толькі будынкі, гарадскія краявіды: у абодвух альбомах шмат унікальных і вельмі цікавых дакументаў. Напрыклад, тастаменты XVI стагоддзя, медаль за ўзяцце горада Полацка

ПОЛАЦК
Крыніца ведаў
і асветы прамень

«Другая кніга — «Полацк. Крыніца ведаў і асветы прамень» — аповед пра горад — духоўны і адукацыйны цэнтр, найбуйнейшы ва Усходняй Еўропе. З кнігі можна даведацца шмат цікавых фактаў пра княгіню Рагнеду, яе сыноў Ізяслава, якога празвалі Кніжнікам, і Яраслава Мудрага, пры якім быў складзены першы звод законаў «Руская праўда» — на 500 гадоў раней за Статут Вялікага Княства Літоўскага!»

Стэфанам Баторыем у 1579 годзе... Такіх прадметаў адзінкі ў свеце. Я вельмі стараўся, каб кнігі пра Полацк захоплівалі тых, хто бярэ іх у рукі.

— За партай Полацкай акадэміі з вашай калекцыі зручна сядзець?

— За ёй стаялі. Яна цікавая, зробленая як секрэтэр. Падобная парта ёсць у Царскасельскім ліцеі, за такой вучыўся Пушкін. Стоячы пісаць больш зручна, так лепш захоўваецца пастава і лягчэй сканцэнтравацца, а мяркуючы па пераліку прадметаў, якія вывучалі ў акадэміі, канцэнтрацыя патрэбная была значная.

— Ці ёсць сярод размешчаных у кнізе калекцыйных прадметаў такі, за якім хаваецца асабістая гісторыя?

— Фатаграфія 1930-х гадоў Івана Антонавіча Мацюшкіна з жонкай. Гэта мой дзед, ён быў першым дырэктарам Полацкага гісторыка-археалагічнага запаведніка.

— Дзед паўплываў на фарміраванне вашага захаплення?

— Не магу сцвярджаць, бо яго не стала, калі я быў малы. Калі пачаў збіраць сваю калекцыю, ён ужо не працаваў. Але я тады збіраў усё: манеты, маркі, значкі, адкрыткі... Так, першыя полацкія адкрыткі мне трапіліся ў дзесяць гадоў. Гэта калекцыяй нельга назваць, але яны першыя.

— Які быў Полацк у XIX стагоддзі?

— Зялёным. Яго ўпрыгожвалі Сафійскі і Мікалаеўскі саборы, храмы Барысаглебскага манастыра. Галоўныя вуліцы былі брукаваныя, там і тратуары былі брукаваныя, на іншых вуліцах — драўляныя, іх мянялі кожны сезон. Гэта ўжо была не сталіца, але былая веліч адчувалася: Замкавая гара, рака, вежы храмаў... Калі глядзіш на старыя адкрыткі, адчуваеш гэта. І мне хочацца перадаць такое адчуванне іншым людзям і наступным пакаленням. Таму і кнігі з'явіліся, і назвы ў іх такія: «Першая сталіца» і «Крыніца ведаў і асветы прамень». Гэта важна памятаць.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

На слыху

КАВА ЯК АРТ-ПРАДУКТ

Як гэта зрабіць — ведае толькі барыста

З нядаўняга часу ў нашай краіне афіцыйна з'явілася чатыры новыя прафесіі — наладчык апаратнага праграмнага забеспячэння, мантажнік фасадных сістэм, лазеншчык і барыста. Аказваецца, найменне ўсіх прафесій вызначаецца ў адпаведных кваліфікацыйных даведніках. Новыя прафесіі з'яўляюцца ў тым ліку праз прафесійны стандарт. Пасля зацвярджэння прафстандартаў прафесія можа быць унесена ў штатны расклад арганізацыі, а потым па гэтай прафесіі можна прымаць на працу.

ЦЯПЕР рыхтуецца прафесійны стандарт «фларыст» і «лічбавая метралогія». Аб гэтым заявіла **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА**.

Паводле яе слоў, пры з'яўленні запатрабаванасці на рынку працы новай прафесіі сектаральны савет кваліфікацый стварае рабочую групу для распрацоўкі прафесійнага стандарту. Ініцыятарам часта з'яўляюцца асацыяцыі, буйныя арганізацыі, якія звяртаюцца для распрацоўкі прафстандарту.

«Так было з прафесійным стандартам «барыста». Распрацоўку прапанавала асацыяцыя рэстаратараў Беларусі, «лазеншчык» — асацыяцыя прыкладной эстэтыкі і СПА, «фларыст», які мы цяпер распрацоўваем, — каледж дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта. А па ініцыятыве трактарнага завода распрацоўваецца прафесійны стандарт «лічбавая метралогія», — сказала Наталля Паўлючэнка.

І лазеншчыкі, і барыста сёння паспяхова знаходзяць працу праз папулярныя сэрвісы ў інтэрнэце.

АД барыста чакаюць не толькі ўменняў рыхтаваць напоі. У абавязкі таксама ўваходзяць навыкі зносін з гасцямі, касавае абслугоўванне, прыборка сталоў і падтрыманне парадку ў кавярні. Зарабляць можна ад 600 да 1200 рублёў у залежнасці ад установы і графіка працы.

Ад прафесійных фларыстаў чакаюць уменні даглядаць кветкі, кансультаваць кліентаў пры выбары, складаць букеты, падтрымліваць месца ў чысціні і працаваць з вітрынай. За гэта работадаўцы гатовы плаціць ад 700 да 1900 рублёў у месяц у залежнасці ад вопыту і гандлёвага пункта.

Барыста даслоўна можна перавесці як «чалавек, які стаіць каля бара». Гэта бармен, але працуе не з кактэйлямі і алкаголем, а звязаны з мастацтвам гатавання кавы, валодае навыкам латэ-арт і ўмее прыгожа падаць напой пакупніку. Прафесія стала папулярная ў пачатку 1980-х.

Першапачаткова прафесія барыста ўзнікла ў Італіі. Аднак вядомая стала дзякуючы амерыканскаму прадпрымальніку Говарду Шульцу, заснавальніку кампаніі Starbucks, які ў 1980 годзе наведаў Італію і быў захоплены прыгажосцю майстэрства прыгатавання кавы. Ён зняў усе элементы падрыхтоўкі і падачы напою на відэа і пасля добра вывучыў увесь працэс. У хуткім часе яго першая кавярня з падрыхтаванымі супрацоўнікамі пачала квітнець і прыносіць яшчэ большы даход.

Барыста і ўладальнік установы ў адной асобе — частая з'ява. У Еўропе барыста — мужчыны ад 30 гадоў і вышэй, бо на Захадзе гэты від дзейнасці прыносіць досыць высокі прыбытак. Таксама справа ў тым, што барыста ў Еўропе — гэта не праца, а, можна сказаць, прызванне. У асноўным барыста ў Еўропе — і гаспадар кафэ, і афіцыянт, і прыбіральшчык. У Беларусі ж на сёння барыста працуюць у асноўным дзяўчаты ва ўзросце 18—23 гадоў. Хлопцы — радзей, але ўжо таксама ў немалой колькасці.

Сёння ў некаторых краінах, у той жа Італіі, ёсць нават сямейныя кланы, якія самі гадуюць збожжа кавы, падрыхтоўваюць і абсмажваюць уласнаручна і ведаюць велізарную колькасць варыяцый падрыхтоўкі кававых напояў.

Сёння барыста — не проста раздатчык. Гэта чалавек, здольны ператварыць напой у арт-праект, а працэс яго падрыхтоўкі — у займальнае шоу.

СТАЦЬ прафесійным барыста можна любому чалавеку — дастаткова проста мець жаданне працаваць у гэтай сферы. Навучыцца навыкам можна трыма спосабамі: самастойна, на месцы працы і на курсах.

Адзін з найлепшых спосабаў асвоіць мастацтва гатавання кавы — гэта знайсці свабодную вакансію ў кавярні. Звычайна ў прафесійных кавярнях з задавальненнем навучаць бясплатна людзей, гатовых працаваць барыста. Адной з галоўных якасцяў пры прыёме на работу з'яўляецца прыемны знешні выгляд, веданне замежных моў, добразычлівасць і таварыскасць.

Больш эфектыўна адразу ўладкавацца ў кафэ стажорам. Ёсць таксама спецыяльныя курсы, дзе можна навучыцца быць прафесійным знаўцам кавы, авалодаць мастацтвам гатавання кавы і кававых напояў, а таксама вывучыць спосаб афармлення эспрэса пад назвай «латэ-арт». Такія курсы даволі дарагія, бо ў асноўным усё праводзіцца на практыцы на спецыяльным прафесійным абсталяванні.

Якасць абсталявання ў кавярні паказвае, якім атрымаецца прадукт. Галоўным абсталяваннем з'яўляецца прафесійная кававая машына, у якой будуць даступныя розныя функцыі гатавання.

Адзін з галоўных інструментаў для барыста — кавамолка з дазоўкай для прамога адціску ў ражок. Тым самым з зерняў увесь смак і водар пяройдуць у свежы гарачы напой.

Абавязкова выкарыстоўваць свежую ачышчаную ваду, таму лепш трымаць фільтр непадалёк ад кавараркі, каб было зручна.

Тэмпер — гэта спецыяльны інструмент для прэсоўкі і ўшчыльнення перамолатых зерняў у холдары. Яны абавязкова павінны быць зроблены з металу, каб смак прыгатаванай кавы быў вытанчаны і не мяняў свой прысмак пры судакрананні з іншымі элементамі. Звычайна тэмпер захоўваецца побач з кавараркай, бо пастаянна неабходны. І звычайна выкарыстоўваецца спецыяльны кілімок для прэсоўкі кавы ў холдары, каб не падрапаць інструменты.

Пітчар — спецыяльная ёмістасць з носікам для ўспенівання малака, якое выліваецца ў каву або выкарыстоўваецца для падрыхтоўкі малюнкаў на паверхні напою з выкарыстаннем латэ-арту.

Пра тое, як прыгатаваць сапраўдную каву, карэспандэнту «Звязды» расказаў Георгій БАРЫЧЭЎСКІ. Ужо больш за год ён працуе ў кавярні ў адным з буйных гандлёвых цэнтраў сталіцы. Вось чым падзяліўся ён з намі:

— Галоўнае ў рабоце барыста — наладзіць кантакт з наведвальнікамі. Важна не толькі ўмець прыгатаваць каву, але і зрабіць гэта прыгожа і зарадзіць кліента на пазітыўны дзень. Барыста павінен ведаць, якім чынам было прыгатавана зерне кавы, адкуль яно, як і колькі можна захоўваць і г. д.

Прафесіянал павінен разбірацца, які памол кавы патрэбны для падрыхтоўкі розных варыяцый. І, вядома, самай галоўнай задачай барыста з'яўляецца выключнае валоданне кававым апаратам: або гэта звычайная кавараркa, або прафесійнае абсталяванне.

САПРАЎДНЫ барыста ўмее ствараць на паверхні кавы любы малюнак. Адна з выдатных якасцяў прафесіяналізму барыста — валоданне мастацтвам латэ-арт, — калі на напоях з асновай эспрэса на пенцы ствараюць прыгожыя малюнкі з малака або вяршкоў. Такім чынам, сапраўдны барыста павінен быць не толькі спецыялістам у падрыхтоўцы кавы, але і добрым псіхолагам, шоуменам і дызайнерам.

Барыста павінен умець гатаваць каля 40 разнавіднасцяў кавы, ведаць усе тонкасці, умець вызначаць ступень абсмажвання па пяху, адрозніваць гатункі кавы і паходжанне зерня, умець рабіць малюнкі на кававай пене і шмат чаго іншага. Стаць прафесійным барыста можна любому, дастаткова проста мець жаданне працаваць у гэтай сферы.

Георгій Барычэўскі лічыць, што ў методыцы падрыхтоўкі кавы важны яго гатунак. «У нашай кавярні выкарыстоўваецца 100 % арабіка. Для таго каб зрабіць сапраўдную каву, неабходна засыпаць яе ў кавамолку і правільна наладзіць памол — па норме, прапісанай у тэхналагічнай кніжцы. Пасля памолу трэба зрабіць эспрэса і праверыць наяўнасць крэмаў, якія даюць каве насычаны густ і водар».

Эспрэса — аснова любога кававага напою. Так, напрыклад, той жа капучына ўяўляе з сябе эспрэса, разведзенае ўзбітым цёплым малаком. Латэ ж робіцца наадварот: спачатку ў шклянку наліваецца малако з багатай колькасцю пены, пасля чаго дадаецца эспрэса.

Памол кавы ідзе ў спецыяльную частку кавамашыны, якая называецца холдар. У ім фармуецца кававая таблетка. У кубачак холдара паступае памолатая кава. Пры дапамозе адмысловага прыстасавання — тэмпера — памолатая кава ўтрамбоўваецца, у выніку чаго атрымліваецца таблетка. Пасля гэтага холдар устаўляецца ў саму кавамашыну. У ёй вада пад ціскам праходзіць у холдар, адбываецца экстракцыя эспрэса.

«Каб навучыцца правільна ўзбіваць малако, спачатку мы практыкаваліся на вадзе з мылам, расказвае Георгій. — Калі ўтварылася пена, значыць, усё робіш правільна. Таксама мы заўсёды трымаем руку на дне кубка, каб вымераць тэмпературу. Так, напрыклад, капучына павінен быць пад тэмпературай у раёне 70 градусаў, каб пасля падачы кліенту яго адразу можна было піць».

На ўзбітым малацэ можна рабіць розныя малюнкі. Першы малюнак — звычайна «Сэрца», потым ужо «Разэта» — больш складаны і вытанчаны.

Паводле слоў эксперта, акрамя падрыхтоўкі кавы, важную частку займае работа з кліентамі, якія заўсёды на першым месцы. Менавіта ад таго, як ты абслужыш, залежыць, ці вернуцца да цябе зноў. Таксама немалаважна выконваць касавую дысцыпліну, чысціню і парадак на працоўным месцы.

Сярод моладзі прафесія барыста набірае папулярнасць. Раней назва прысвойвалася ўсім апаратам машын па гатаванні эспрэса. Цяпер у сваёй рабоце прадстаўнікі гэтай, ужо паўнавартаснай, прафесіі выкарыстоўваюць розныя прыстасаванні, а таксама незвычайныя тэхнікі падачы на аснове натуральнай кавы.

Сёння барыста — не проста раздатчык. Гэта чалавек, здольны ператварыць напой у арт-праект, а працэс яго падрыхтоўкі — у займальнае шоу.

Адны маладыя людзі праходзяць навучанне на «кававага майстра» для агульнага развіцця або проста з мэтай падпрацоўкі. Для іншых гэта становіцца справай жыцця, асновай перспектыўнай кар'еры.

ТАКІМ чынам, прафесія барыста падыдзе артыстычным асобам, якія любяць ствараць, мець стасункі, пазнаваць нешта новае і ўвесь час удасканальвацца. Дастаткова прайсці навучальныя курсы, працягласць якіх складае ад некалькіх дзён да пары месяцаў. Многія работадаўцы запрашаюць маладых людзей, самастойна і бясплатна арганізуючы для іх вучобу.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Надвор'е

ЛЕТАМ І НЕ ПАХНЕ

Апошнія дні вясны будуць халаднаватымі і дажджлівымі

Па-сапраўднаму майскае надвор'е нам толькі сніцца. А атмасферны фронт, які гэтымі днямі ўжо пачаў аказваць свой уплыў на заходнія рэгіёны нашай краіны, выцесніў за межы Беларусі цёплыя паветраныя масы, і гаспадаром надвор'я стала больш халоднае паветра, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Згодна з папярэднім прагнозам, перыяд надвор'я з паніжаным тэмпературным рэжымам захаваецца ў нашай краіне прынамсі да сярэдзіны наступнага тыдня. Пры гэтым франтальныя падзелы працягваюць пастаўляць на тэрыторыю Беларусі ўсё новыя і новыя «порцыі» ападкаў. На сённяшні дзень сума ападкаў па краіне ўжо дасягае часам 99 % майскай нормы, на асобных метэастанцыях зарэгістраваныя перавышэнні нормы апошняга вясновага месяца (Барысаў —108 %, Магілёў — 101 %), і толькі па тэрыторыі Брэсцкай вобласці колькасць ападкаў, якія выпалі, пераважна складае 21—40 % ад належнай за гэты перыяд колькасці.

А ў суботу на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны ў асобных раёнах магчымыя навальніцы. Удзень месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 4—10 градусаў, а ўдзень — ад плюс 11 да 18 цяпла.

У нядзелю будзе таксама мокра, але стане крыху цяплей. У гэтыя суткі ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі нашай краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 3 да 9 градусаў, удзень — ад плюс 13 да 19 цяпла, а па поўдні слупок тэрмометра падымецца да 21 градуса вышэй за нуль.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў, у панядзелак будзе не самы добры дзень для шпацыраў. У гэты дзень у многіх раёнах краіны прагназуюцца дажджы. Месцамі пройдуць навальніцы, удзень — моцныя дажджы. Начное паветра прагрэецца да плюс 6—13 градусаў, удзень будзе да плюс 12—19 градусаў, а па паўднёвым усходзе — да 22 цяпла.

У апошні дзень мая на большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах — навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 7—14 градусаў, а днём — 15—22 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Сядзі і глядзі

СЯБРОЎСКАЕ ВЫХАВАННЕ

На тэлеканале «НТБ-Беларусь» у вячэрнім эфіры ў суботу пакажуць ваенную кінаапавесць «Юрка — сын камандзіра». Фільм рэжысёра Мікалая Лук'янава ўбачыў свет на кінастудыі «Беларусьфільм» у 1984 годзе, але і сёння яго паглядзець варта.

Па сюжэце сямігадовы Юрка з сям'ёй пераязджае на беларускую пагранзаставу і там даведваецца, што ў новым месцы зусім няма яго аднагодкаў. А пасля выпадковае знаёмства з яфрэйтарам Шахназаравым перарастае ў сяброўства. І калі старэйшы таварыш трапляе з цяжкай ранай (атрыманай пры затрыманні злачынца) у шпіталь, то хлопчык не задумваючыся прапаноўвае сваю кроў...

Аднак гісторыя не толькі гэтых двух герояў звяртае на сябе ўвагу. У карціне таксама добра адлюстроўваюцца і сямейныя ўзаемаадносіны. Хоць падчас прагляду можа скласціся ўражанне, быццам гэта толькі фон для галоўнага. Тата на працы, маці дбае пра дом — звычайная справа. Але вось ці ёсць ім час і жаданне выхоўваць дзяцей не намінальна — пытанне. І нават калі хтосьці скажа, быццам час быў такі, то ўсё роўна неяк гэта гучыць непераканаўча. Бо набыццё жыццёвага вопыту побач з роднымі — таксама неад'емная частка выхавання і сталення. І нішто нашымі дзецьмі так не цэніцца і не запамінаецца, як час, праведзены разам.

Алена ДРАПКО.
Фота з адкрытых крыніц.

Героі на граніцы

У суботу, 28 мая, сваё прафесійнае свята адзначаць пагранічнікі. На сацыякультурным канале «Беларусь 3» з гэтай нагоды пакажуць мастацкія фільмы «Застава ў гарах» і «Брэсцкая крэпасць».

Кінастужку «Застава ў гарах» знялі на «Беларусьфільме» ў 1953 годзе, фільм быў у той час у тройцы лідараў кінапракату. На экране тэлеаўдыторыя ўбачыць гісторыю пра пагранічнікаў ад рэжысёра Канстанціна Юдзіна... З Масквы на паўднёвую заставу прыязджае старшы лейтэнант Лунін, якога прызначылі намеснікам начальніка. Але з-за хваробы начальства мужчыну даводзіцца прыняць камандаванне на сябе. А ў гэты час амерыканская разведка (яны прыкідваюцца вучонымі-геолагамі) спрабуе пранікнуць на тэрыторыю СССР для правядзення дыверсій. І мясцовая групоўка злачынцаў арганізоўвае нападзенне на савецкую тэрыторыю, каб прыкрыць асноўную аперацыю. Аднак задума дыверсантаў раскрываецца і план застаецца няздзейсненым...

Не прапусціце кінасеанс у суботу на тэлеканале «Беларусь 3». Яркія прыгоды і сустрэча з любімымі акцёрамі вартыя, каб паглядзець кінастужку.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ
(«Звязда»)

Выпуск № 166

Каманда Магілёўскай вобласці перамагла ў рэспубліканскай спартакіядзе па шашках сярод дзяцей і юнацтва па месцы жыхарства, якая праходзіла з 17 да 20 мая ў Пінску. На другім месцы шашысты Гомельскай вобласці. Бронзавыя медалі выйграла каманда Віцебскай вобласці.

Усе сённяшнія пазіцыі складзены вядучым аддзела.

№ 67



№ 67
Белыя простыя: g1, f4, d6, h6, a7 (5)
Чорныя простыя: b2, d2, e3, f6, g7, f8 (6)
№ 68
Белыя простыя: c3, e3, c5, дамкі a7 (4)
Чорныя простыя: a3, f4, g5, c7, e7, g7 (6)
№ 69
Белыя простыя: b4, c5, дамкі a7 (7)
Чорныя простыя: b2, a3, g3, a5, c7, e7 (6)
№ 70
Белыя простыя: d2, c3, e5, d6, h6, c7 (6)
Чорныя простыя: f2, h2, a3, g3, f4, g5 (6)
№ 71
Белыя простыя: 47, 41, 42, 23, 16, 17, 11, 15 (8)
Чорныя простыя: 36, 31, 32, 33, 28, 25, 6, 8, 1 (9)
№ 72
Белыя простыя: 50, 43, 29, 21, 17, 19, 13, 9 (8)
Чорныя простыя: 41, 38, 31, 32, 26, 20, 4 (7)
№ 73
Белыя простыя: 43, 44, 30, 21, 24, 17, 13 (7)
Чорныя простыя: 41, 38, 31, 32, 35, 26, 28, 23 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваны.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 165 ад 13.05. 22

№ 60 1. f4-g5 h6:f4 2. e7-d8 c5:e7 3. d8:c1 a3:c5 4. f2-g3 h2:f4 5. c1:b4 d4-e3 6. b4-e1 +

№ 61 1. f6-g7 h6:f8 2. e5-d6 c5:e7 3. f4-g5 h2:h6 4. h4-g5 h6:f4 5. c1:d2+

№ 62 23, 18, 19, 1, 3+

№ 63 19,10, 4, 2+

№ 64 42, 12, 3, 14, 24 (37), 47+

№ 65 1. g7-h8 b6-c5 2. c1-b2 a1:c7 3. b8:g3 c5-d4 4. h8:a5 a3-b2 5. a5-c3 b2:d4 6. g3-f4 d4-c3 7. f4-c1+

№ 66 1. c1-d2 a3:e3 2 .g1-h2 d4:b2 3. h2:f8 b8:d6 4. f8:h6 e5-d4 5. h6-d2+

Першымі дакладныя адказы даслалі: Л. Трафімчык (Іўе), А і А. Высоцкія (г. Копыль), С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (Магілёўская вобл., Клімавіцкі р-н, в. Уздзевічы), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі, (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013», e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сустрэчы

Уладзімір БЯРЭЗІН: «Усё можна памяняць, а вось голас і розум не зменіш»

Яго імя добра ведае больш дарослае пакаленне, а таксама ўсе, хто любяць фестываль «Славянскі базар у Віцебску», дзе народны артыст Расіі Уладзімір Бярэзін з самага пачатку з'яўляецца нязменным вядучым. На нядаўняй сустрэчы са студэнтамі ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце дыктар, рэжысёр распавёў пра сваё бачанне і адчуванне развіцця тэлебачання, пра мудрасць і ўсведамленне каштоўнасці ўласнай біяграфіі і кожнага сказанага слова...

Пра законы жыцця, вопыт і стаўленне да новага

— У маёй маладосці адной з галоўных прафесій на тэлебачанні лічылася «дыктар». Чалавек, які ад імя цэлай каманды размаўляе з тымі, хто знаходзіцца па іншы бок экрана. З канца 1970-х я тады пачаў працаваць у сістэме савецкага тэлебачання ў маленькім горадзе Арле. Пасля былі дзесяць плённых гадоў у Свярдлоўску. Даўно ўжо няма некаторых месцаў і людзей, якія спрыялі майму прафесійнаму станаўленню, што мяне, чалавека дарослага, безумоўна, і засмучае, але і матывуе: не забываць, што называлася падмуркам жыцця і прафесіі...

Хоць вы гэта дакладна ведаеце, бо, нягледзячы на сваю маладосць, больш разумныя і прасунутыя. А мы былі людзьмі жорсткай сістэмы. Нам казалі, што вось так і толькі так. Мы гэта прымалі, а потым пачыналі глядзець, што ўсё ж такі знаходзіцца за рамкамі. Вы ж жывяце ў свеце, дзе дастаткова аднаго-двух клікаў, і ўсё — не трэба ні ў кога пытацца. Праўда, мы, дарослыя, думаем: а ці добра гэта? Бо там столькі ўсяго, што можа падмануць, дэзынфармаваць. І пойдзеш, здавалася б, па кароткай дарозе, а пасля ўсвядоміш, што прыйшоў зусім не туды.

Пераехаўшы ў пэўны перыяд свайго жыцця ў Маскву і пачаўшы працаваць на праграме «Время», я трапіў у часы, якія многія з вас не ведаюць. Тады горда гаварыў з экрана пра тое, што ў краіне перамаглі путчыстаў. І з прычыны сваёй маладосці я думаў і верыў, быццам усё важнае, галоўнае і сапраўднае — зусім не тое, што было і фарміравалася за дзесяцігоддзі існавання вялікай краіны з яе складанай гісторыяй (дзе ёсць чым ганарыцца), а тое, што пачнецца заўтра. І калі зараз вы, маладыя, так думаеце, то думайце, бо вам жыць. Але прашу: ніколі не адмаўляйце таго, што было, не думайце, быццам учарашняе — адназначна дрэнна. Бо з часам жыццё ўсё раскладае па-свойму. Проста назірайце і спакойна збірайце інфармацыю. Высновы з'явяцца пазней.

Пра тэлебачанне і супадзенне з аўдыторыяй...

— Па маіх назіраннях, калі ты не ведаеш, што патрэбна аўдыторыі, то лепш перад ёй і не з'яўляцца. А тэлебачанне — школа жыцця, дзе адлюстроўваюцца падзеі і выбудоўваюцца адносіны. Прычым, у адрозненне ад тых жа кіно і тэатра, дзе з гледачом размаўляюць праз вобразы, гэта самы кароткі шлях пабудовы стасункаў, каб цябе зразумелі і ты нечаму мог навучыць.

Усё ў наш час можна змяніць: і знешнасць, і адзенне, а вось голас і розум не зменіш. І ў прафесіі, каб цябе паважалі, ты павінен быць не дурнем. Выходзіць на сцэну варта тады, калі табе там будзе камфортна, бо гэта і прысутнай аўдыторыі парадаецца. Неабходна жаданне выйсці да гледачоў, але яно не павінна перавышаць вашы фізічныя магчымасці. Трэба адпавядаць: пачынаючы ад знешняга выгляду і заканчваючы інфармацыяй, якую будзеце агучваць. Тут арыентавацца можна ці на запыт публікі альбо на ўласныя інтарэсы. Пачуццё гумару і самаіроніі таксама часам выратоўваюць. Сёння, што датычыцца сцэнічнай прасторы, у любы момант могуць сказаць «хопіць». Таму нават у самога сябе трэба атрымаць права, каб цябе не памножылі на нуль.

Сувязі з Беларуссю, дзяцінства ў вёсцы і шчасце

— Я ў тым узросце, калі трэба любіць усіх, а калі не атрымліваецца, то спрабаваць разумець. З Беларуссю звязана палова майго жыцця. Адна нітачка — «Славянскі базар». Іншая — сяброўства з маладымі беларусамі, якія працуюць у маёй камандзе. Ведаю, што такое беларускі менталітэт, і яго душэўна-духоўны складнік вельмі мне пасуе. Падабаецца беларускі характар і форма ўзаемаадносін, хоць я і іншых крывей, бо мама — руская, а бацька — чачэнец. У беларусах я бачу і адчуваю інтэлігентнасць, стрыманасць і годнасць. Так яны ставяцца да ўсяго: і да радасці, і да выпрабаванняў.

У першай палове жыцця я, як і мая мама, увесь свой час прысвячаў працы. І таму, калі б не мая жонка, то не зрабіў бы нічога, што сёння магу лічыць дасягненнямі. Ні ў прафесіі, ні ў побытавым плане, ні адносна ўласнай значнасці. Сваю дачку люблю, як і любы нармальны бацька. Але зараз яе яшчэ і глыбока паважаю, бо яна дасягнула пэўных вышынь як мама, жонка і таленавітыя ў розных сферах чалавек. У ёй я бачу свой працяг. Сёння я нават баюся думаць, што мог не стаць бацькам, а займацца толькі прафесіяй. Таму што калі ў пэўны момант усё зменіцца, то сям'я застанецца. А ўнукі — гэта ўвогуле проста космас.

Сакрэту доўгага і шчаслівага сямейнага жыцця ніхто не ведае. Кожны проста спрабуе свае варыянты і прыдумвае адказы, якія падыходзяць абаім. Я ўдзячны Богу за сустрэчу менавіта з маёй жонкай, якая разгледзела ўва мне чалавека з перспектывай. А што да астатняга, то важна ўменне кожнага ў пары першым разумець, цярпець і прабачаць.

Алена ДРАПКО.
Фота прэс-службы БДЭУ.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 23.50 Зона Х (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Драма «Вір» (16+).
